# § 10. Міжнародная міграцыя ў сучасным свеце

***Успамінаем.*** Праблемы якога характару спрыяюць міжнароднай міграцыі? Успомніце падзеі, што выклікалі найбольш маштабныя перамяшчэнні людзей у гісторыі чалавецтва. Якія праблемы яны пацягнулі за сабой?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Што неабходна прадпрымаць дзяржаве, каб не дапусціць значных маштабаў эміграцыі? Якія праблемы цягне за сабой міжнародная міграцыя?

**Дынаміка маштабаў міжнароднай міграцыі ў свеце і рэгіёнах**. З сярэдзіны XX ст. пачынаецца сучасная эпоха міграцыі насельніцтва свету. Гістарычным яе пачаткам было заканчэнне Другой сусветнай вайны, а галоўнай асаблівасцю — значны рост маштабаў міжнароднай міграцыі. На палітычнай карце свету не засталося дзяржаў, якія не былі б уцягнуты ў міжнародную міграцыю. У параўнанні з 1965 г. колькасць міжнародных мігрантаў у свеце ўзрасла ў 3,5 раза і склала 258 млн чалавек, або 3,4 % насельніцтва свету. Міжнародная міграцыя набыла глабальны характар.

***У свеце ўсё ўзаемазвязана.*** Якія падзеі ў свеце спрыяюць актывізацыі міжнароднай міграцыі? Чаму яна стала глабальным працэсам?

**У свеце цікавага.** У гісторыі чалавецтва класічнай краінай эміграцыі ў XIX ст. была Ірландыя. За некалькі дзесяцігоддзяў пасля Вялікага голаду ў 1840-х гг. (мал. 63) насельніцтва гэтай краіны зменшылася ў два разы. Па долі эмігрантаў у насельніцтве яна заняла першае месца ў свеце. Цяпер у Ірландыі пражывае толькі палова ірландцаў. У ЗША — больш за 40 млн асоб ірландскага паходжання — у 12 разоў больш жыхароў самой Ірландыі. У сярэдзіне XIX ст. у Новы Свет з Ірландыі прыбылі 5000 караблёў з эмігрантамі. Усяго на амерыканскі бераг ступіла крыху больш за мільён чалавек.



Мал. 63. Помнік Вялікаму голаду ў Ірландыі

Звыш 60 % міжнародных мігрантаў пражывае ў Азіі (80 млн чал.) і ў Еўропе (78 млн чал.). Паўночная Амерыка з'яўляецца трэцім рэгіёнам па ліку міжнародных мігрантаў (58 млн чал.). Па колькасці міжнародных мігрантаў на 1000 жыхароў найбольшымі значэннямі вылучаюцца Аўстралія з Акіяніяй і Паўночная Амерыка (4,8 і 3,2 ‰ адпаведна). Тры рэгіёны (Афрыка, Паўднёвая Амерыка і Азія) характарызуюцца міграцыйным адтокам (мал. 64).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 64. Сальда міжнароднай міграцыі па рэгіёнах, 2017 г., ‰




Мал. 65. Найбуйнейшыя краіны паходжання міжнародных мігрантаў, 2017 г., млн чал.

У 2017 г. найбольшая колькасць міжнародных мігрантаў пражывала ў ЗША (50 млн чал.), Саудаўскай Аравіі, Германіі і Расіі (каля 12 млн чал.). Найбуйнейшымі краінамі паходжання міжнародных мігрантаў з'яўляюцца Індыя, Мексіка і Расія (мал. 65). Да іншых краін з вялікай колькасцю мігрантаў адносяцца Кітай, Бангладэш, Сірыя, Пакістан і Украіна.

У структуры міжнародных мігрантаў пераважаюць мужчыны — 52 %. Доля жанчын складае 48 % і пастаянна павялічваецца. Сярэдні ўзрост сучаснага мігранта павялічваецца і складае 39 гадоў. 74 % мігрантаў знаходзяцца ў працаздольным узросце (20–64 гады) (мал. 66).

П3

**Міграцыя ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца.** Галоўнай асаблівасцю міжнароднай міграцыі з'яўляецца міграцыйны адток, што павялічваецца, з краін, якія развіваюцца, у развітыя. Развітыя краіны характарызуюцца станоўчым сальда міграцыі. У краінах, якія развіваюцца, назіраецца адмоўнае сальда міграцыі (мал. 67).




Мал. 66. Полаўзроставая піраміда міжнародных працоўных мігрантаў, 2017 г.




Мал. 67. Дынаміка міжнароднай міграцыі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, ‰

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Паразважаем.*** Дэмаграфічнае развіццё і роля міжнароднай міграцыі ў ім істотна адрозніваюцца ў развітых рэгіёнах свету і рэгіёнах, якія развіваюцца. Пацвердзіце або аспрэчце дадзены выраз.

З канца 1980-х гг. свет характарызуецца надыходам *найноўшага перыяду міграцыі* насельніцтва. Ён сфарміраваўся пад уздзеяннем палітычных, сацыяльна-эканамічных, экалагічных і лакальных фактараў. Асноўнымі падзеямі гэтага перыяду былі распад сацыялістычнай сістэмы гаспадарання, з’яўленне суверэнных дзяржаў і змена іх дзяржаўных меж, пашырэнне меж Еўрапейскага саюза.

**Свет і Беларусь.** Назавіце асноўныя фактары, якія вызначылі трэнды міжнароднай міграцыі насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь на пачатку XXI ст. Якія сферы занятасці з’яўляюцца найбольш прывабнымі для беларускіх мігрантаў у краінах СНД і Заходняй Еўропы?

Павелічэнне разрыву ва ўзроўні жыцця паміж эканамічна развітымі дзяржавамі і дзяржавамі, якія развіваюцца, а таксама ў групе краін, што развіваюцца, выступае фактарам росту патокаў міжнароднай міграцыі (мал. 68).

Асноўным з’яўляецца паток міграцыі з краін, якія развіваюцца, у развітыя краіны (40 %). Аднак з-за павелічэння адрозненняў ва ўзроўні даходаў насельніцтва больш чым кожны трэці міжнародны мігрант сёння выязджае з краін, якія развіваюцца, у краіны, якія развіваюцца (напр., з Гватэмалы ў Мексіку, з Бангладэш у Індыю). Гэта ж прычына тлумачыць міграцыю з развітых у развітыя краіны, на якую прыходзіцца 22 % (напр., з Іспаніі ў Германію).




Мал. 68. Асноўныя патокі міжнароднай міграцыі паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, %

**Калідоры міжнароднай міграцыі.** Значныя маштабы міжнароднай міграцыі разам з гістарычнымі перадумовамі прывялі да фарміравання ў свеце ўстойлівых і вялікіх па колькасці патокаў мігрантаў паміж асобнымі краінамі. Гэта з’ява атрымала назву «міграцыйны калідор». Усяго іх налічваецца 15. Самым буйным з’яўляецца калідор паміж Мексікай і ЗША, дзе колькасць міжнародных мігрантаў складае каля 13 млн чалавек (мал. 69).

***Папрацуем з атласам.*** Пакажыце на палітычнай карце свету асноўныя калідоры міжнародных міграцый: **Мексіка** — **ЗША**; **Індыя** — **ААЭ**; **Расія** — **Украіна**. Чым вы можаце растлумачыць іх фарміраванне?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 69. Асноўныя міграцыйныя калідоры свету, 2017 г., млн чал.




Мал. 70. Нелегальныя мігранты з Сірыі

Прычына міграцыі ў межах калідораў, як правіла, эканамічная — магчымасць знайсці работу насельніцтву з краін, якія развіваюцца. Аднак у апошнія гады прычынай часта становяцца палітычныя падзеі ў краіне, напрыклад у Сірыі (мал. 70).

**Сучасныя віды міжнароднай міграцыі і іх геаграфія.** Асноўнай формай міжнароднай міграцыі ў сучасным свеце з'яўляецца працоўная міграцыя. Яе фактарамі выступаюць: адрозненні ва ўзроўні жыцця насельніцтва; прыцягненне таннай працоўнай сілы з краін, якія развіваюцца; узросшая залежнасць шэрага галін гаспадаркі і відаў эканамічнай дзейнасці развітых краін ад працы замежных рабочых з дзяржаў, якія развіваюцца. Колькасць працоўных мігрантаў складае 150,3 млн чалавек, або каля 60 % міжнародных мігрантаў. Больш за 70 % з іх працуюць у сферы паслуг, каля 20 % — у прамысловасці. Кожны дзясяты заняты ў сельскай гаспадарцы (мал. 71). 56 % у структуры складаюць мужчыны і 44 % — жанчыны.

$П_4$

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Павелічэнне маштабаў працоўнай міграцыі прыводзіць да росту колькасці замежнай працоўнай сілы ў структуры працоўных рэсурсаў развітых краін. Па даных Міжнароднай арганізацыі міграцыі, у Аўстраліі доля замежных рабочых складае 24,5 %, Канадзе — 19,1, Швейцарыі — 18,4, ЗША — 12,4, Аўстрыі, Бельгіі, ФРГ — каля 10 %.

Сучасныя грамадзянскія войны і змена палітычных рэжымаў прыводзяць да міграцыі насельніцтва па палітычных прычынах. *Палітычная міграцыя* набывае ў свеце ўстойлівыя маштабы. У выніку палітычных канфліктаў і перамяшчэння насельніцтва, якое зведвае прыгнёт рознага характару (рэлігійнага, расавага, ідэалагічнага),




$П_5$

Мал. 71. Структура занятасці міжнародных працоўных мігрантаў, 2017 г., млн чал.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

гэты від міграцыі фарміруе з’яву бежанства. Сёння колькасць бежанцаў нашмат меншая за колькасць эканамічных мігрантаў, але застаецца значнай.

Адной з новых форм выступае *міграцыя высокакваліфікаваных кадраў* («brain drain»), або *інтэлектуальная міграцыя*. Рэгіёнам з найбольшай эміграцыяй насельніцтва з вышэйшай адукацыяй з’яўляецца Лацінская Амерыка. Больш за 80 % насельніцтва з вышэйшай адукацыяй Гаіці, Сурынама, Ямайкі пакідаюць свае краіны.

У шэрагу дзяржаў Афрыкі (Эфіопія, Нігерыя, Кенія, ПАР) больш за 60 % высокакваліфікаваных асоб эмігрыруюць. Для гэтых дзяржаў выезд спецыялістаў з’яўляецца сур’ёзнай праблемай будучага развіцця.

**У свеце цікавага.** Дзяржавамі, якія вядуць найбольш актыўную палітыку па прыцягненні высокакваліфікаваных мігрантаў, з’яўляюцца ЗША, Вялікабрытанія, Канада і Аўстралія. Найбольшай доляй замежных навукоўцаў і даследчыкаў у свеце вылучаюцца Швейцарыя (57 %), Аўстралія (45 %) і ЗША (38 %).

$П_6$ Рост колькасці моладзі ў краінах, якія развіваюцца, прывёў да фарміравання *міжнароднай студэнцкай міграцыі*. Сёння колькасць студэнтаў, якія вучацца за мяжой, складае 4,8 млн чалавек. Большасць замежных студэнтаў прадстаўлена афрыканскай, арабскай і кітайскай моладдзю. Самымі мабільнымі з’яўляюцца студэнты краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары. Кожны 16-ты афрыканскі студэнт навучаецца за мяжой. У шасці краінах налічваецца 67 % замежных студэнтаў свету. Гэта ЗША (23 %), Вялікабрытанія (12), Германія (11), Францыя (10), Аўстралія (7) і Японія (5 %).

$П_7$ Глабальныя змены клімату, прыродныя бедствы прывялі да з’яўлення *кліматычнай міграцыі*. З-за засух і недахопу вады, павышэння ўзроўню мора, стыхійных бедстваў і экстрэмальных тэмператур 143 млн чалавек у свеце з’яўляюцца кліматычнымі мігрантамі. Найбольшая частка іх прыходзіцца на тры рэгіёны — Афрыку на поўдзень ад Сахары, Паўднёвую Азію і Лацінскую Амерыку.

**У свеце цікавага.** З-за стыхійных бедстваў у 2017 г. 18,8 млн чалавек былі вымушаны мігрыраваць. Паўднёвая і Усходняя Азія, Карыбскі басейн і Ціхаакіянскі рэгіён з’яўляюцца найбольш слабымі рэгіёнамі. У Кітаі, на Філіпінах і Кубе ў 2017 г. адбылася найбольшая колькасць выпадкаў стыхійных бедстваў. Малыя астраўныя дзяржавы, якія развіваюцца, таксама адчуваюць негатыўнае ўздзеянне стыхійных бедстваў.

Нягледзячы на тое, што кліматычная міграцыя адбываецца ў асноўным у межах краіны, значная частка насельніцтва вымушана перасяляцца за мяжу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Падвядзём вынікі.** Міжнародная міграцыя — гэта працэс, які гістарычна склаўся. Асноўнымі прычынамі міжнароднай міграцыі з'яўляюцца ... . Колькасць міжнародных мігрантаў у свеце пастаянна ... . Для развітых краін характэрна ... сальда міграцыі, для краін, якія развіваюцца, — ... . Вылучаюць наступныя віды міжнароднай міграцыі: ..., ..., ..., ..., ... .

***Праверым свае веды.*** 1. Назавіце асноўныя прычыны міжнароднай міграцыі. 2. Назавіце асноўныя калідоры міжнародных міграцый і растлумачце іх геаграфію. 3. Назавіце і пакажыце на карце краіны студэнцкай іміграцыі. 4. Назавіце і пакажыце на карце краіны з самай вялікай доляй замежных рабочых.

***Ад простага да складанага.*** 1. Растлумачце, чаму прыкладам умелай узаемасувязі міграцыі працоўнай сілы з узроўнем эканамічнага развіцця з'яўляецца Японія. 2. Падумайце, якія краіны з пункту гледжання міжнароднай міграцыі называюцца краінамі-донарамі, а якія — краінамі-рэцыпіентамі.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Запоўніце табліцу ў сшытку.

**Прычыны і геаграфія сучасных міжнародных міграцый**

| Віды міграцый | Прычыны міграцый | Адкуль? | Куды? |
| --- | --- | --- | --- |
| Палітычная | | | |
| Эканамічная | | | |
| Працоўная | | | |
| Кліматычная | | | |
| Студэнцкая | | | |

П8

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***

Міжнародная база даных працоўнай міграцыі.

Агульныя вынікі міграцыі насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне